# МІЖДЗЯРЖАЎНЫЯ АДНОСІНЫ РАСІІ І РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ У XVII ст.: НАВУКОВЫЯ ПОГЛЯДЫ В. В. КЛЮЧЭЎСКАГА

**А. В. Дземідовіч**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*пр. Незалежнасці, 4, 220030, Мінск, Беларусь, dzemhelen@mail.ru*

У артыкуле разглядаюцца навуковыя погляды расійскага гісторыка В. В. Ключэўскага адносна міждзяржаўных стасункаў Расіі і Рэчы Паспалітай у XVII ст. Мэта дадзенага артыкула — выяўленне спецыфікі адлюстравання міждзяржаўных адносін Расійскай дзяржавы і Рэчы Паспалітай у XVII ст. у навуковай спадчыне В. В. Ключэўскага. Аб'ект даследавання — навуковыя погляды В. В. Ключэўскага; прадмет — асвятленне стасункаў Расійскай дзяржавы і Рэчы Паспалітай у адзначаны перыяд у працах В. В. Ключэўскага. Аўтар аналізуе меркаванні і ацэнкі гісторыка адносна падзей, якія склалі змест двухбаковых адносін у акрэслены перыяд.

***Ключавыя словы:*** гісторыя; знешняя палітыка; расійская гістарыяграфія; Расійская дзяржава; Рэч Паспалітая.

# INTERSTATE RELATIONS BETWEEN RUSSIA AND THE POLISH-LITHUANIAN COMMONWEALTH IN THE 17th CENTURY: SCIENTIFIC VIES OF V. KLYUCHEVSKY

**Alena Dzemidovich**

*Belarusian State University,*
*Niezaliežnasci Avenue, 4, 220030, Minsk, Belarus, dzemhelen@mail.ru*

The article examines the scientific views of the Russian historian V. Klyuchevsky on interstate relations between Russia and the Polish-Lithuanian Commonwealth in the 17th century. The purpose of this article is to identify the specifics of the reflection of interstate relations between the Russian state and the Polish-Lithuanian Commonwealth in the 17th century. in the academic heritage of V. Klyuchevsky. The object of the study is the scientific views of V. Klyuchevsky. The subject of the study is the coverage of relations between the Russian state and the the Polish-Lithuanian Commonwealth during this period in the works of V. Klyuchevsky. The author analyzes the historian's opinions and assessments regarding the events that formed the content of bilateral relations in this period.

***Keywords:*** history; foreign policy; Russian historiography; Russia; the Polish-Lithuanian Commonwealth.

В. В. Ключэўскі належыць да класікаў акадэмічнай расійскай гістарычнай думкі. Ён пакінуў багатую творчую спадчыну, якая вызначаецца не толькі высокімі навуковымі вартасцямі, але і адметнасцю стылю

выкладання матэрыяла, што ў некаторай ступені радніла яго навуковыя пошукі на гістарычнай ніве з літаратурнай творчасцю. Нават сам В. В. Ключэўскі некаторы час лічыў сябе больш філолагам, чым гісторыкам. Вучоны-даследчык, выкладчык-лектар, аратар, майстар афарызмаў і экспромтаў — кожная грань асобы В. В. Ключэўскага была адзначана здольнасцямі, амаль кожная прафесійная справа, чым даводзілася займацца, — поспехам. Шматграннасць В. В. Ключэўскага як гісторыка відавочна: акрамя таго, што ім была прапанавана канцэпцыя гістарычнага працэсу Расіі, што з'явілася галоўным навуковым інтарэсам, і сістэматызавана выкладзена ў «Курсе рускай гісторыі», выдадзеным у 1904—1910 гг., ён распрацоўваў пытанні, якія закранаюць праблемныя полі сумежных з гісторыяй навук і дысцыплін: этналогіі і этнаграфіі, гістарыяграфіі і крыніцазнаўства, метадалогіі гісторыі. Талент, які прынёс даследчыку папулярнасць і прызнанне грамадскасцю, беумоўна, быў вынікам спалучэння прыроднага дару і працавітасці, але выкрышталізоўваўся не без уплыву настаўнікаў В. В. Ключэўскага — Ф. І. Буслаева і С. М. Салаўёва, хоць гісторык і не быў іх безумоўным ідэйным паслядоўнікам.

Як ужо было згадана вышэй В. В. Ключэўскі, прапанаваў уласную канцэпцыю расійкай гісторыі, дзе прадстаўлены яе перыядызацыя, глыбокія абагульненні-высновы, а таксама шырока прадэманстраваны праблемны падыход, што практыкаваўся даследчыкам пры выкладанні гісторыі.

В. В. Ключэўскі як даследчык, ствараючы панараму гістарычнага працэсу, засяродзіў увагу амаль на ўсіх сферах грамадства, пры гэтым імкнуўся прасычыць узаемасувязі складаных працэсаў. Не без увагі засталіся і пытанні знешняй палітыкі Расіі.

Мэта дадзенага артыкула — выяўленне спецыфікі адлюстравання міждзяржаўных адносін Расійскай дзяржавы і Рэчы Паспалітай у XVII ст. у навуковай спадчыне В. В. Ключэўскага.

Аб'ект даследавання — навуковыя погляды В. В. Ключэўскага; прадмет — асвятленне стасункаў Расійскай дзяржавы і Рэчы Паспалітай у адзначаны перыяд у працах В. В. Ключэўскага.

Аўтар дадзенага артыкула пры звароце да прац В. В. Ключэўскага вызначыў ключавыя моманты-праблемы, паспрабаваўшы выявіць погляды расійскага гісторыка адносна іх.

**Храналагічныя межы паводле В. В. Ключэўскага.** В. В. Ключэўскі прапанаваў уласную перыядызацыю гісторыі, вылучыўшы 4 перыяды. «Апошнім перыядам, даступным вывучэнню на ўсёй сваёй працягласці», вучоны назваў час з пачатку XVII ст. да пачатку царствавання імператара Аляксандра II, абазначаўшы ніжнюю мяжу 1613 г. — годам уступлення на прастол Міхаіла Раманава, а верхнюю, што відавочна, — 1855 г. «Смутная эпоха самазванцаў» адпаведна даследчыку — пераходны час на мяжы двух перыядаў [1, с. 5]. В. В. Ключэўскі падкрэсліваў асаблівае значэнне гэтага часу ў гістарычным лёсе Расіі, у адрозненні ад шэрагу

гісторыкаў — яго папярэднікаў, сучаснікаў і паслядоўнікаў, — якія ў якасці пераломнага моманту ў расійскай гісторыі называлі пятроўскую эпоху.

***Агульная ацэнка міжнароднага становішча Расійскай дзяржавы і яе знешнепалітычных памкненняў.*** Даследчык адзначае вялікі ўплыў міжнароднага становішча дзяржавы на яе ўнутраны лад у абазначаны перыяд (увесь чацвёрты перыяд адпаведна яго перыядызацыі), заўважаючы, што ў XVII ст., пасля тэрытарыяльных страт Смутнага часу знешняя барацьба стала надзвычай цяжкай, што прывяло да змен грамадскага ладу [1, с. 13]. В. В. Ключэўскі разгортвае думку аб пераломе, які адбыўся ў знешняй палітыцы Расіі ў гэты час: пачынаючы з Палтавы войны «набываюць наступальны характар», маюць на мэце ўмацаваць пазіцыі Расіі ва Усходняй Еўропе, альбо захаваць еўрапейскую раўнавагу. Адносна войнаў расійскай дзяржавы на Захадзе да Палтавы гісторык піша, што былі яны «па сутнасці абарончыя», вяліся з мэтай вярнуць нядаўна страчаныя землі, ці тыя, якія лічыліся «исконным достоянием» [1, с. 13]. Праўда, адсутнічаюць тлумачэнні, якім чынам аўтар бачыць узаемасувязь абарончага характару вайны з мэтай вяртання зямель, якія ўжо не належаць дзяржаве. Тут ускосным чынам Ключэўскім паказана ўласная ацэнка статуса тых тэрыторый, якія характарызаваліся зменай дзяржаўнай прыналежнасці па выніках канфліктаў Рэчы Паспалітай з Расіяй 1609—1618 гг. і 1654—1667 гг.

**Смутны час у поглядах В. В. Ключэўскага.** Адпаведна поглядам В. В. Клюэўскага, Смутны час у Расіі быў выкліканы некалькімі акалічнасцямі: спыненнем старой дынастыі са смерцю ў 1598 г. цара Фёдара — сына Івана Грознага, а затым — з’яўленнем самазванца — Ілжэдзмітрыя. Аднак, як адзначае даследчык, гэтыя падзеі набылі разрушаючую моц для Расіі ў сілу іншых абставін, сярод якіх — грамадска-палітычны лад часоў Івана Грознага і «гадуноўкія інтрыгі» [1, с. 46]. Падрабязна разглядаюцца даследчыкам і значна глыбейшыя прычыны Смуты, аналіз якіх выходзіць па-за межы задач, пастаўленых у гэтым артыкуле.

Адносна з’яўлення Ілжэдзмітрыя I даследчыкам прадстаўлена думка, што ідэя стварэння самазванца належала колу баяр, якія падвергліся ганенням Барыса Гадунова: самазванец «быў толькі спечаны ў польскай печы, а заквашаны ў Маскве»; аднак Ключэўскі прызнае падтрымку каралём Рэчы Паспалітай Ілжэдзмітрыя [1, с. 30; 32].

З’яўленне другога Ілжэдзмітрыя В. В. Ключэўскі тлумачыць прыкладна так: чуткі аб выратаванні Ілжэдзмітрыя I пайшлі ледзьве не з першых хвілін панавання Васіля Шуйскага. Такім чынам, выхад на палітычную сцэну другога самазванца быў справакаваны незадавальненнем расійскім грамадствам наяўным царом. Гісторык як бы падсумоўвае прычыны гэтай з’явы — самазванства — у Расіі: «Самазванства станавілася стэрэатыпнай формай рускага палітычнага мышлення, у якую адлівалася ўсялякае грамадскае незадавальненне» [1, с. 37]. Разам з тым адзначаецца падрымка

Ілжэдзмітрыя II «польска-літоўскімі і казацкімі атрадамі» і негалосна — «польскім урадам» [1, с. 38]. Апошні момант, на думку В. В. Ключэўскага, абумовіў зварот В. Шуйскага за дапамогай супраць тушынскага лагера да Карла IX. Станоўчы адказ шведскага караля на гэту просьбу вымусіў цара заключыць вечны саюз са Швецыяй, накіраваны супраць Польшчы. Так, менавіта «Польшча» ўжывае часта В. В. Ключэўскі такі тэрмін там, дзе павінна быць дзяржаўнае ўтварэнне «Рэч Паспалітая», а Расійская дзяржава ў пазначаны перыяд у гісторыка — «Маскоўская дзяржава». Знешнепалітычнай арыентацыяй Васіля Шуйскага — пагадненнем са Швецыяй і пэўнымі саступкамі на карысць ёй — тлумачыць разрыў Жыгімонтам III адносін з Масквой і асаду Смаленска восенню 1609 г. [1, с. 38]. Даследчыкам выдатна прааналізаваны змест дагавора ад 4 лютага 1610 г., які быў падпісаны паміж тушынскім станам і манархам Жыгімонтам III, аб умовах абрання маскоўскім царом каралевіча Уладзіслава, а таксама дагавор маскоўскіх баяр і С. Жалкеўскага ад 17 жніўня 1610 г. Звернута ўвага на матывы, якімі кіраваліся бакі, ідучы на такія крокі. В. В. Ключэўскі паўстае не толькі як выдатны гісторык, які лёгка ўскрывае прычынна-выніковыя сувязі, але і як тонкі псіхолаг, здольны патлумачыць прыроду чалавека [1, с. 39—42]. Поспех кандыдатуры каралевіча Уладзіслава гісторык тлумачыць сацыяльнай барацьбой унутры расійскага грамадства, у якуюператварылася Смута: вярхі грамадства пагадажаліся прыняць сына Жыгімонта III, каб не дапусціць на прастол тушынскага вора — «кандыдата чэрні» [1, с. 45].

Трэба сказаць, што знешнепалітычным аспектам Смуты, у тым ліку і факталагічным, В. В. Ключэўскі ўдзяляе няшмат увагі. Лейтматывам праходзіць сцвярджэнне аб умяшальніцтве «палякаў», «польскіх шаек», «отбросов московского и польского государственного общества» ў кожныя моманты смутнага часу, якія вылучаў В. В. Ключэўскі [1, с. 47]. Даследчык адзначае малапрыгоднасць, што было прадэманстравана падчас Смуты, дваранскага апалчэння да яго саслоўнага рамяства і дзяржаўнага абавязку. В. В. Ключэўскі звяртае ўвагу, што крамлёўскі гарнізон сдаўся сам, без штурму, па прычыне голада; а Жыгімонта III з-пад Масквы восенню 1612 г. прымусілі адступіць і вярнуцца дамоў казацкія атаманы, а не маскоўскія ваяводы [1, с. 57].

Лекцыі аб Смутным часе Расіі большым чынам даюць разуменне механізма функцыянавання дзяржавы і грамадства ў другой палове XVI — першай палове XVII ст., і, безумоўна, аб наступствах звадак, якія сказаліся на палітычнай практыцы Расійскай дзяржавы, у тым ліку і ў сферы знешняй палітыкі.

**Знешнепалітычнае становішча Расійскай дзяржавы пасля Смутнага часу.** Даследчык вылучае некалькі асноўных наступстваў для Расіі ў знешнепалітычным плане. Па-першае, тэрытарыяльныя страты: на карысць Швецыі, што зафіксавана дагаворам у Сталбове 1617 г., і на карыс-

ць Рэчы Паспалітай, што засведчыў Дэўлінскі дагавор. Па-другое, «пренебрежение», якое зведала дзяржава ад суседзяў пасля Смуты, альбо, г. зн. рэпутацыйныя выдаткі. Вярнуць страчаныя тэрытарыяльныя пазіцыі, на думку В. В. Ключэўкага, было нацыянальным доўгам новай дынастыі і ўмовай яе трываласці, што і ўвасаблялася ў жыццё. Як адзначае гісторык, войны па свайму паходжанню абарончыя, «самі сабой» ператварыліся ў наступальныя, мэтай якіх сталі землі, якімі Расія яшчэ не валодала [1, с. 86—87].

**Падзеі 1654—1667 гг. у поглядах В. В. Ключэўскага.** «Маларасійскае пытанне» («украінскае») гісторык лічыць зыходным момантам знешняй палітыкі Расіі з паловы XVII ст. [1, с. 87], якое актуалізуецца з таго часу, калі ў 1654 г. «паўстаўшая супраць Польшчы Маларасія аддалася пад абарону маскоўскага гаспадара». Гэта прывяло да новай вайны Расіі з Рэччу Паспалітай. Гісторык неаднаразова ўскосным чынам узгадвае папярэднія міждзяржаўныя канфлікты, гаворачы аб «смаленскіх і северскіх рахунках Масквы з Рэччу Паспалітай» [1, с. 87], аб патаемных помыслах Расіі ўзяць рэванш за вайну 1632—1634 гг. [1, с. 109]. Аналізуючы падзеі канца 1640- х — пачатку 1650-х гг. даследчык адзначае, што Масква заняла пазіцыю чакання тэрмінам у 6 гадоў, пачынаючы ад выступлення Б. Хмяльніцкага і да 1654 г. — уласна да пачатку вайны [1, с. 110]. Такое прамаруджванне тлумачыцца наборам фактараў: бояззю парушыць мір з заходнім суседам, чаканнем знясілення гэтага суседа і падзення пазіцый Багдана Хмяльніцкага [1, с. 110—112].

У прынцыпе агульная ацэнка знешнепалітычнага курсу Расіі пры вырашэнні «маларасійскага пытання» даецца В. В. Ключэўскім праз падвядзенне яе вынікаў: ускладненні ў знешняй палітыцы на некалькі дзесяцігоддзяў, раздробленасць сіл у змаганні з Польшчай, абмежаванне тэрытарыяльнымі набыткамі на левабярэжнай Украіне [1, с. 112—113].

Аповяд В. В. Ключэўскага аб драматычных часах 1654—1667 гг. не вызначаецца наяўнасцю багатага факталагічнага матэрыялу. Відавочна, аўтар не ставіў такую задачу. Агульная канва падзей выкладаецца без падрабязнасцей апісання ваенных і дыпламатычных дзеянняў: В. В. Ключэўскі не адступае ад праблемнага падыходу. Праз такую ж метадалагічную прызму гісторык ацэньвае **месца Рэчы Паспалітай у сістэме геапалітычных каардынат:** закранае балтыйскае пытанне і яго ўплыў на двухбаковыя адносіны Расіі і Рэчы Паспалітай; увязвае заключэнне Андросаўскага перамір'я 1667 г. з асцярогамі адносна Асманскай імперыі, на якую арыентаваўся ў той час гетман Пётр Дарашэнка, палітычныя амбіцыі якога ў аднолькавай ступені палохалі і Рэч Паспалітую і Расію [1, с. 115]. Андросаўскі дагавор даследчык лічыць пэўным рубяжом у знешняй палітыцы Расіі: змаганне з Рэччу Паспалітай перапыняецца, знешняя палітыка Масквы канцэнтруецца на іншых задачах — урэгуляванні адносін са Швецыяй і Турцыяй, для чаго патрабаваўся саюз з Польшчай. В. В. Ключэўскі

прыводзіць доказы таго, што саюз з Рэччу Паспалітай быў неабходны Расіі для рэалізацыі шэрагу мнагагранных знешнепалітычных ідэй, дзе сярод галоўных з'яўлялася вырашэнне Расіяй аднаго з элементаў усходняга пытання: дасягнення кантролю над дунайскімі княствамі. Такая ідэя сістэмна выкладзена ў запісцы А. Ардын-Нашчокіна, пададзенай цару яшчэ напярэдадні Андросаўскага дагавору, асноўныя палажэнні якой называе В. В. Ключэўскі [1, с. 115].

В. В. Ключэўскі сцвярджае і тлумачыць узаемасувязь трох важнейшых праблем, якія выйшлі на міжнародны парадак дня ў другой палове XVII ст. — «маларасійскага», балтыйскага і ўсходняга пытанняў [1, с. 116—117]. Прычым заўважае, што першае пацягнула за сабой два наступных, адзначаючы, што ўсходняе пытанне вынашвалася толькі тэарэтычна. Заўважым, што ўсходняе пытанне знаходзілася нават не толькі на стадыі ідэйных асэнсаванняў яго вырашэння, яно яшчэ нават не сфармулявалася ва ўсёй яго мнагамернасці і складанасці, дзеля разблытвання чаго Расіі ў наступныя стагоддзі давядзецца змагацца дыпламатычнымі і ваеннымі метадамі.

Даследчыкам неаднаразова тлумачацца матывы дзеянняў маскоўскай дыпламатыі ў адносінах да Рэчы Паспалітай у залежнасці ад палітычнай, дакладней геапалітычнай кан'юнктуры: так, у адным выпадку Расія спрабуе адгаварыць султана ад вайны з Рэччу Паспалітай, у другім — Масква спрабуе сама схіліць сваю суседку да саюзу супраць Асманскай імперыі, у іншым — з цікавасцю выслухае прапановы Швецыі і Турцыі аб нейтралізацыі патэнцыйнага суперніка — Рэчы Паспалітай.

У якасці высновы заўважым, што немагчыма не пагадзіцца з В. В. Ключэўскім аб тым, што перыяд другой паловы XVII ст., пасля Андросава, ці нават крыху раней, прынцыпова новы ва ўзаемастасунках Расіі і Рэчы Паспалітай. Дзяржавы прайшлі шлях ад выразнай канфрантацыі да сітуатыўнага ўзаемадзеяння, аднак, па-ранейшаму яго ступень і глыбіню вызначалі ўсе ж такі ўласныя інтарэсы, сярод якіх для Рэчы Паспалітай на першым месцы стаяў клопат аб сваёй знешняй бяспецы.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. Ключевский, В. О. Сочинения : в 9 т. / под ред. В. Л. Янина. — М. : Мысль, 1987—1990 . — Т. 3 : Курс русской истории. Ч. 3. — 1988. — 414 с.